*2. Святое Писание Нового Завета;*

*3. Беседа преподобного Серафима Саровского о цели христианской жизни с симбирским помещиком и совестным судьей Николаем Александровичем Мотовиловым (Из рукописных воспоминаний Н.А.Мотовилова);*

*4. Святое Писание Ветхого Завета.*

**Шык К.І.**
**(Беларусскі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў)**

## Роля хрысціянскіх святаў у патрыятычным выхаванні моладзі

Моладзь, якая складае 25% ад насельніцтва нашай краіны[3], прымае актыўны ўдзел у шматлікіх святах як у якасці удзельнікаў, так і гледачоў. На працягу стагоддзяў беларусы стваралі разнастайныя формы абрадаў і святаў, якія адлюстроўвалі розныя бакі грамадскага жыцця.

У нашай краіне існуе шмат разнастайных па сваёй спецыфіцы і тэматыцы свят, пэўнае месца сярод якіх займаюць хрысціянскія.

На сучасным этапе, хрысціянскія святы аднаўляюць ў памяці маладога пакалення вышэйшыя каштоўнасці, адсунутыя ад паўсядзённага быцця, з якімі звязаныя сэнс быцця асобы або ідэнтычнасць грамадства, якія лічацца падмуркам культуры, найважнейшымі і абавязковымі для жыцця. Падчас хрысціянскага свята адбываецца канцэнтрацыя культурнага жыцця і мастацкай творчасці[4]. Правядзенне такіх свят аказвае ўплыў на вялікія масы людзей, розныя пласты грамадства, усе сферы дзейнасці сучаснага чалавека: працу, дом, сям'ю, спрыяе патрыятычнаму выхаванню.

Згодна даследчыцы Дзегцяровай М.А.: "патрыятычнае выхаванне – гэта фарміраванне ў чалавека духоўных каштоўнасцей, якія адлюстроўваюць спецыфіку развіцця грамадства і дзяржавы, нацыянальнай самасвядомасці, светаразумення і адказнасці за лёс Радзімы" [2.с.158]. В.В. Буткевіч вызначае патрыятычнае выхаванне як "фарміраванне важнейшых духоўных якасцяў, патрыятычных пачуццяў, клопату аб інтарэсах сваёй Радзімы, гонару за мінулае сваёй краіны" [1.с.13]. Такім чынам, можна вызначыць, што выхаванне патрыятызму аб'ектыўна абумоўлена патрабаваннямі грамад-

ства, што гэта катэгорыя маральная, заснаваная на развіцці ў асобы ўсяго чалавечага: дабрыні, спачування, міласэрднасці, інтарэса да духоўных, матэрыяльных каштоўнасцей Радзімы.

Для выяўлення ролі хрысціянскіх святаў сярод моладзі, было праведзена апытанне грамадскай думкі. У анкетаванні і інтэрв'юіраванні прынялі ўдзел 100 чалавек ад 16 да 31 года, розных сацыяльных слаёў, прафесіі, каштоўнасных арыентацый. Пытанні былі накіраваны на выяўленне такіх аспектаў як:

- Стаўленне сучаснага маладога чалавека да святаў, якія нясуць пэўную каштоўнасную нагрузку;

- Успрыманне хрысціянскай культуры і святаў, як неад'емнай часткі жыцця сучаснай моладзі.

Апытанне паказала вялікую зацікаўленасць людзей дадзенай тэматыкай. Так, 95% апытаных адказалі, што любяць святы і з задавальненнем іх адзначаюць. Аднак моладзь падкрэсліла, што аддае перавагу дзяржаўным святам. Сярод названых фігуравалі такія святы як Новы Год, 8 Сакавіка, 9 Мая, Дзень Незалежнасці. Іх назвалі практычна ўсе сацыяльныя пласты і ўзроставыя групы. У сваю чаргу моладзь адзначае і спецыфічныя святы, звязаныя са студэнцкай субкультурай – Дзень студэнта, дзень Св. Валянціна, 1 верасня. Моладзь больш старэйшага ўзросту аддае перавагу прафесійным святах, такім як дзень настаўніка, дзень работнікаў культуры, дзень медыцынскага работніка, мытні і г.д. Сваё становучае стаўленне да хрысціянскіх святах выказалі каля 72% удзельнікаў апытання. 21% ставіцца да іх нейтральна або абыякава. У веданні асноўных хрысціянскіх святаў вынікі апынуліся падобнымі. Называліся такія святы як Вялікдзень, Нараджэнне Хрыстова, Пакровы. Святкуюць ж гэтыя святы ў сваіх сем'ях практычна ўсе, што звязана з традыцыйнымі каштоўнасцямі беларускага народа.

Акрамя таго, даследаванне дазваляе зрабіць вывад, што хрысціянскія святы – неад'емная частка жыцця сучаснага грамадства. Яны з'яўляюцца своеасаблівым праваднікам культуры, духоўных каштоўнасцей, а значыцца і патрыятызма.

Хрысціянскія святы падтрымліваюць і ўмацоўваюць духоўную сувязь паміж членамі грамадства, стымулююць групавую кансалідацыю, спрыяюць самаідэнтыфікацыі членаў групы, класа, грамадства, арганізуюць супольную жыццядзейнасць людзей. У гэтым складаецца галоўнае адрозненне хрысціянскіх святаў як сродку з'яднання людзей ад многіх іншых святочных дзей, якія не заўсёды

вырашаюць пэўныя задачы патрыятычнага выхавання моладзі, бо ў цяперашні час, нягледзячы на існаванне добрых святочных мерапрыемстваў, адбываецца засілле нізкапробных узораў масавай культуры і выцясненне якасных узораў айчынных і замежных свят, што з'яўляецца адным з чыннікаў маральнай дэградацыі, страце ўласнай культурнай ідэнтычнасці, прымітывізацыі сацыяльных і культурных запытаў шматлікіх маладых людзей і грамадства. Акрамя гэтага, скажоная сучасная інтэрпрэтацыя розных духоўных святаў, такіх як Дзень ўсіх святых, які атрымаў назву Хэлуін, сёння суправаджаецца пераапрананнем у персанажаў нячыстай сілы і мерцвякоў, запальваннем злавесных свяцілень, што з'яўляецца сапраўдным акультызмам, які зусім процілеглы евангельскім прынцыпам. Таксама камерцыялізацыя і традыцыя грамадскага святкавання Дня святога Валянціна не маюць нічога агульнага з сапраўдным яго зместам. Не апошнюю ролю ў гэтым працэсе граюць заганы срэбралюбства і асабістай нажывы, бо тэндэнцыі цэнавай палітыкі на рынку пэўных тавараў і паслуг празрыста пра гэта сведчаць. Усе гэтыя скажоныя спосабы святкавання вышэйзгаданых святаў зусім не адпавядаюць хрысціянскім, бо падмяняюць сапраўдныя хрысціянскія каштоўнасці чалавечымі прыхільнасцямі, што адмоўна ўплывае на моладзь.

Адна з пераваг хрысціянскіх святаў у рашэнні задачы патрыятычнага выхавання моладзі складаецца ў духоўнай дзейнасці як альтэрнатывы пасіўнаму ўспрыманню імі прымітыўных відовішчаў і забаваў.

Хрысціянскае свята актуалізуе каштоўнасці народа, тым самым яднаючы яго удзельнікаў. Разам з тым, хрысціянства злучае духоўнымі ніцямі пакаленні, падтрымваючы адзінства грамадства. Гэта можна прасачыць у такіх святах як “Нараджэнне Хрыстова”, “Вялікдзень”, “Пакровы”, дзе моладзь разам з людзьмі старэйшымі за сябе прасякнута адзінай мэтай і ідэяй. Гэтыя святы не проста забяспечваюць адзінства каштоўнасных арыенціраў, але маюць прамое дачыненне да фарміравання каштоўнасна-маральных, патрыятычных накірункаў маладога пакалення.

Можна з упэўненасцю сказаць, што хрысціянскія святы - гэта своеасаблівая педагагічная сістэма, якая арганічна звязаная з ўсёй выхаваўчай работай у пэўнай сацыяльнай злучнасці. Яна забяспечвае сталае выхаваўчае ўздзеянне на людзей, адлюстроўвае іх светапогляд.

Такія каштоўнасці як любоў да бліжняга, спачуванне, узаемадапамога, міласэрнасць, беражлівыя адносіны да наваколля, шанаванне бацькоў, павага да законаў краіны ляжаць у аснове маральных канцэпцый хрысціянства. Назапашаны стагоддзямі выхаваўчы вопыт праваслаўнай, каталіцкай, пратэстанцкай цэркваў знаходзіць актыўнае прымяненне ў галіне адукацыі, выхавання і сацыяльнай рабоце, спрыяючы выхаванню маральна сталай, духоўна развітай асобы, якая будзе любіць, паважаць і працаваць на карысць сваёй Радзімы.

Выкарыстанне хрысціянскіх святаў важна сёння не толькі для ўспрымання традыцый продкаў, але і для духоўнай кансалідацыі грамадства, умацавання патрыятычных пачуццяў у падрастаючага пакалення.

Такім чынам, можна сцвердзіць, што значэнне хрысціянскіх святаў у жыцці моладзі і грамадства ў цэлым, цяжка пераацаніць. У іх адлюстроўваецца гістарычнае, духоўнае жыццё грамадства, ідэі, інтарэсы і імкненні самых розных сацыяльных пластоў. Многія аспекты і функцыі хрысціянскіх святаў спрыяюць таму, што ў святочны перыяд асоба знаходзіць магчымасць значна больш поўна пазнаць духоўныя, гістарычныя і святыя ісціны. Дачыненне чалавека да свята вызначаецца перадусім яго раннімі перыядамі сацыялізацыі, калі падчас выхавання ён успрымае культурныя нормы, звычаі, каштоўнасці свайго народа. Што ў значнай меры падкрэслівае важную ролю хрысціянскіх святаў у патрыятычным выхаванні моладзі.

*Спіс выкарыстанай літаратуры:*

*1. Буткевич, В.В. Патриотическое воспитание учащихся: история и современность: пособие для педагогов общеобразовательных учреждений, учреждений внешкольного воспитания и обучения / В. В. Буткевич. - Минск: Национальный институт образования, 2010. - 207 с.*

*2. Дегтярёва, М.А. Патриотическое воспитание в учебных заведениях отрасли культуры; научные редакторы: сб. науч.ст. / Московский гоударственный университет культуры и искусств; редкол.: И.Н.Романов, Г.А.Смирнов (отв. ред.)[и др.]- Москва : МГУКИ, 2004. - 236 с.*

*3. Інтэрнэт партал [Электронны рэсурс] // Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь.- Рэжым доступу: http://belstat.gov.by.-дата доступу: 5.12.2013.*

*4. Інтэрнэт партал [Электронны рэсурс] // Навуковая бібліятэка Украіны.- Рэжым доступу: http://www.info-library.com.ua.-дата доступу: 5.12.2013.*

**П.В. Рахманько**
**(ГУО «Белорусский государственный университет культуры и искусств»)**

## Социальные сети Интернета как средство реализации социально-культурных потребностей молодежи

Принято считать, что свое начало теория потребностей берет от немецкой школы гештальтпсихологии, рассматривающей потребности как двигатель человеческой деятельности, как динамическое состояние, возникающее у человека при реализации его намерений.

В сфере культуры формирование потребностей определяется рядом факторов: изменениями социально-экономической ситуации в стране, довольно скромной культурной инфраструктурой, миграционными процессами, изменениями в социально-культур-ном облике молодежи как наиболее мобильной группы населения, а также потребностью в свободном времени [5, с.73].

Социально-культурные потребности можно сгруппировать следующим образом:

- информационная потребность (теоретико-познавательная), интерес человека к познанию окружающей действительности и применение этого знания в практической деятельности с целью воздействия на природу и общество и создания нового продукта материальной и духовной жизни;

- ценностно-нравственная потребность, стремление к развитию таких нравственных сторон поведения и характера личности, как чувство социальной справедливости, ответственности за общество и за собственные поступки. На реализацию этих потребностей не в последнюю очередь влияют такие факторы, как разница в куль-